# ИСТОРИЯ



**НОВІКАЎ С.Я., кандыдат гістарычных навук, дацэнт МДЛУ**

**Рэцэнзент ЛІПЕЦКІ Э. А., кандыдат гістарычных навук, дацэнт МДЛУ**

## Падмурак навуковых гістарычных ведаў – Гістарычныя крыніцы: знаёмства з новым архіўным дакументам

Перадапошні год зыходзячага веку не толькі наблізіў кожнага з нас да гістарычнага рубяжа змены тысячагоддзяў, але і адсунуў яшчэ далей ад даты вызвалення беларускай зямлі з-пад нямецка-фашысцкай акупацыі. У беларускай гістарыяграфіі праблеме гісторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны прысвечаны цэлы шэраг самых розных навуковых выданняў. Як паказвае адно з найноўшых,[1] вывучэнне падобных падзей мінулага ніколі не спыніцца — такая заканамернасць гістарычнай навукі. Прычым яе сённяшні дзень усё больш завастрае ўвагу прафесійных даследчыкаў на пошуку сутнасці новых навуковых падыходаў, дзе на першым месцы будзе стаяць featured рознабаковасць і альтэрнатыўнасць поглядаў на старонкі як далёкага, так і блізкага мінулага, аб'ектыўнасць вывучэння кожнага гістарычнага факта і яго глыбокае асэнсаванне.

Патрэба ў новых падыходах да падзей, фактаў, з'яў гісторыі Беларусі ўвогуле і пытанняў Вялікай Айчыннай вайны ў прыватнасці выклікана шэрагам зменаў, якія мелі месца ў жыцці краіны і яе народа толькі ў апошнім дзесяцігоддзі. У выніку гэтага стала магчыма:

*па-першае,* выкарыстанне новых дакументальных крыніц, якія раней па розных прычынах былі недаступныя даследчыкам;

*па-другое,* вывучэнне гістарычнага мінулага на глебе толькі гістарычнай рэчаіснасці, а не ў строга вызначаным партыйна-дзяржаўнымі ўладамі рэчышчы;

*па-трэцяе,* пераацэнка навуковых здабыткаў папярэдняй распрацоўкі шматлікіх гістарычных пытанняў, у тым ліку ваенных часоў.

У дачыненні да апошняга трэба адзначыць, што пры асвятленні шматлікіх падзей нашай трагічнай гісторыі беларускае грамадства так і не мае сцвярджальнага адказу адносна ступені вывучанасці тых ці іншых не такіх яшчэ

далёкіх падзей. Ці датычыць гэта пачатковага перыяду гітлераўскай акупацыі Беларусі, ці фактаў усталявання акупацыйнага рэжыму, ці правядзення масавых забойстваў мірнага насельніцтва, ці дакладнай лічбы людскіх страт, ці прычын удзелу беларусаў на баку гітлераўскіх захопнікаў і г.д. Праводзячы аналіз навуковай літаратуры, манаграфічных даследаванняў, мемуарных сведчанняў, мы тым не менш вымушаны заключыць, што ў навукоўцаў ёсць не толькі жаданне, але і ўсе падставы па-іншаму паглядзець на многія пытанні гісторыі Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Аднак толькі пры абавязковай умове выкарыстання дакументальных крыніц, прычым самага рознага паходжання і месцазнаходжання.

Да ліку такіх можна аднесці "**Першы ўказ фюрэра** (*правадыра, заўвага аўтара.* **— С.Н.) аб увядзенні грамадзянскага кіравання на новазанятых усходніх тэрыторыях**" Указ быў прыняты 17 ліпеня 1941 г. Аднак да сёння заставаўся практычна невядомы для шырокага кола беларускіх чытачоў.[2] Больш таго, не былі знаёмы з гэтым гістарычным дакументам і айчынныя даследчыкі, якія прафесійна займаліся вывучэннем праблем гісторыі Беларусі ваеннага часу. Для некаторага выпраўлення такога становішча толькі ў апошні час з'явілася добрая магчымасць, прычым дзякуючы працы нямецкіх калег-гісторыкаў. Яны правялі навуковае даследаванне па тэме масавых забойстваў на тэрыторыі краін Прыбалтыкі і Беларусі, і пры гэтым выдалі збор матэрыялаў, аснову якіх складаюць архівы: Беларусі (Брэст, Мінск), Літвы (Вільнюс), Латвіі (Рыга), Расіі (Масква), а таксама Германіі (Бон, Лудвігсбург, Фрайбург), Ізраіля (Іерусалім), ЗША (Вашынгтон) і інш.

Такое выданне пабачыла свет у Цэнтры даследаванняў Берлінскага тэхнічнага універсітэта пад кіраўніцтвам Вольфганга Бенца. На працягу трох апошніх гадоў (з 1996) тут выдадзена 6 кніг з серыі "Нацыянал-сацыялістычная акупацыйная палітыка ў Еўропе: 1939 — 1945". Адзначым, што мэта навуковых пошукаў даследчага цэнтра мае дваякі сэнс: *па-першае,* спроба ліквідаваць навуковы і грамадскі дэфіцыт ведаў па згаданай праблеме; *па-другое*, надаць ёй (праблеме) сапраўды "еўрапейскі" характар з мэтай пераадолення дамінуючых дагэтуль нацыянальных абмежаванняў.

Згаданая вышэй гістарычная крыніца надрукавана ў апошнім выданні серыі, якая выйшла пад уласнай назвай "Выкарыстана ў "Рэйхскамісарыяце Остланд": Дакументы па генацыду ў краінах Прыбалтыкі і Беларусі. 1941 — 1944" (Берлін: Метрополь, 1998. 301 с.).[3] Дакумент мае навуковую легенду. Знойдзены ён у Федэральным архіве, які знаходзіцца ў Ліхтэрфельдзе. Першая гістарычная згадка пра дакументальную крыніцу сустракаецца ў "Пісьме рэйхсміністра і начальніка імперскай канцылярыі* ў адрас вышэйшых германскіх устаноў ад 18 ліпеня 1941 г. з адбіткам "*Першага ўказа фюрэра аб увядзенні грамадзянскага кіравання на нова-*

* Маецца на ўвазе Ламмэрс (ням., Lammers, Hans Heinrich) [1879 — 1962 ] — юрыст па адукацыі, палітык Трэцяга Рэйха. Прафесійную дзейнасць пачаў у 1901 годзе ў юрыдычнай службе. У 1904 абараняе дысертацыю і працягвае працу ў якасці суддзі. Пасля заканчэння першай сусветнай вайны займае пасады ў германскім міністэрстве ўнутраных спраў. У 1932 уступае ў Нацыянал-сацыялістычную аб'яднаную партыю Германіі (НСДАП). З 1933 прызначаны на пасаду дзяржаўнага сакратара імперскай канцылярыі. З 1937 — рэйхсміністр і начальнік імперскай канцылярыі. Да ўсяго, з 1939 у складзе савета міністэрства абароны, а з 1940 — першага штаба дарадцаў пры Гітлеры. Пасля заканчэння вайны быў асуджаны Міжнародным ваенным трыбуналам да 20-цігадовага турэмнага зняволення, аднак ужо ў 1952 выходзіць з турмы.

*занятых усходніх тэрыторыях" ад 17.07.1941"*.[4] Пры гэтым Ламмэрс згадвае пра адбіткі іншых указаў, што былі прыняты фюрэрам у самы апошні час. Сярод якіх:

1. Указ фюрэра аб кіраванні новымі ўсходнімі тэрыторыямі ад 17.07.1941 разам з іншымі ўказамі, якія прымаліся ў гэтай сувязі, у тым ліку:

а) аб прызначэнні камандуючых вайсковымі фармаваннямі вермахта на новазанятых усходніх тэрыторыях ад 25.06.1941;

b) аб эканоміцы на новазанятых усходніх тэрыторыях ад 29.06.1941;

с) аб паліцэйскай ахове новазанятых усходніх тэрыторый ад 17.07.1941;

2. Першы ўказ фюрэра аб увядзенні грамадзянскага кіравання на новазанятых усходніх тэрыторыях ад 17.07.1941.

Пасля такога ўступу Ламмэрс прыводзіць змест "Першага ўказа", які складае сабой невялікі тэкст крыху больш за дзесятак радкоў. Прычым і яны падзелены на тры нязначныя часткі. Сутнасць кожнай з іх вызначаецца больш маштабнымі падзеямі, якія мелі дачыненне да значных тэрытарыяльных абшараў на Усходзе, у тым ліку і ў Беларусі. Канкрэтна дакумент выглядае так:

"Першы ўказ фюрэра (Падкрэслена ў арыгінале. — *заўвага аўтара*).
аб увядзенні грамадзянскага кіравання
на новазанятых усходніх тэрыторыях.
17 ліпеня 1941 года"[5]

I

[...]

Тэрыторыя былых свабодных дзяржаў Літвы, Латвіі і Эстоніі, а таксама абшары, на якіх пражываюць беларусы, пераходзяць пад грамадзянскае кіраванне з падпарадкаваннем рэйхсміністру* па занятых усходніх тэрыторыях. Уся тэрыторыя ўтварае рэйхскамісарыят пад назвай "Остланд"**, што адпавядае майму ўказу аб кіраванні новазанятымі ўсходнімі тэрыторыямі ад 17 ліпеня 1941 года. Кіраванне малымі ўсходнепрускімі раёнамі, якія мяжуюць з былой свабоднай дзяржавай Літва, застаецца ў падпарадкаванні обер-прэзідэнта па правінцыях.

II

Знешнія межы рэйхскамісарыята Остланд і астатнія тэрыторыі, якія акрэслены раздзелам I, я буду самастойна вызначаць і канчаткова ўстанаўліваць у адпаведнасці з ходам ваенных дзеянняў і згаданым тэрмінам. Таксама я буду вызначаць час для ўвядзення грамадзянскага кіравання на тэрыторыях і іх частках, якія вызначаны раздзелам I.

---

* Маецца на ўвазе Розенберг (ням., Rosenberg, Alfred), [1883 — 1946] — імперскі міністр па занятых усходніх тэрыторыях, прызначаны на пасаду рэйхсміністра ў адпаведнасці з загадам фюрэра ад 17.07.1941. Па паходжанні Розенберг — прыбалтыйскі немец: З 1919 г. выконваў ролю галоўнага ідэолага партыі, у якой стварыў і ўзначаліў знешнепалітычны аддзел. Разам з Гітлерам распрацоўваў планы сусветнага панавання на аснове расавай тэорыі. Яшчэ да нападу на СССР прапанаваў план яго падзелу на рэйхскамісарыяты, у тым ліку: Прыбалтыкі, Беларусі, Украіны, Каўказа, Ленінграда і Масквы. На Нюрнбергскім працэсе Міжнародны ваенны трыбунал вынес Розенбергу прысуд у смяротным пакаранні, як аднаму з галоўных нацысцкіх ваенных злачынцаў.

** Рэйхскамісарыят Остланд — вышэйшы орган гітлераўскага грамадзянскага кіравання на акупаванай тэрыторыі Літвы, Латвіі, Эстоніі і часткі Беларусі. Быў падпарадкаваны рэйхсміністэрству па занятых усходніх тэрыторыях на чале з рэйхсміністрам Розенбергам. У адпаведнасці з "Першым указам" ад 17.07.1941 рэйхскамісарам Остланда прызначаны гаўляйтэр і обер-прэзідэнт Лозэ (гл. наступную заўвагу. — С.Н.).

III

Рэйхскамісарам Остланда я прызначаю гаўляйтэра (*кіраўніка на ўзроўні зямлі, края, вобласці, — заўвага аўтара.* — С.Н.) і обер-прэзідэнта Генрыха Лозэ*. Ён мае сваю рэзідэнцыю ў Рызе.

Стаўка фюрэра, 17 ліпеня 1941.

Фюрэр

Адольф Гітлер**

Начальнік штаба галоўнага камандавання вермахта

Кейтэль***

Рэйхсміністр і начальнік імперскай канцылярыі

Д-р Ламмэрс

BA, R 43II/68a, fol. 3, 9f.

(*Пераклад аўтара*. — С.Н.)

Такім чынам, публікацыя арыгінальнага дакумента дазваляе гісторыкам зрабіць адпаведныя ўдакладненні ў храналогію падзей па ажыццяўленні гітлераўскіх планаў захопу і падзелу тэрыторый былых дзяржаў СССР, на абшарах якіх уводзіліся як ваенныя, так і грамадзянскія формы кіравання. Апрача таго, знаёмства з дакументам дае грунтоўныя падставы для ўдакладнення некаторых момантаў не толькі гістарычнага, але і навуковага кшталту. У першую чаргу гэта датычыцца назвы адной з дзяржаўных устаноў Трэцяга Рэйху, вядомага як "Reichsministerium für die besetzten Ostgebiete".[6] Як вынікае з гістарычных даследаванняў пасляваеннага часу, у савецкай, сучаснай расійскай і айчыннай гістарыяграфічных работах ва ўжытак увайшлі назвы, азначэнні якіх маюць дэфініцыйныя разыходжані з арыгінальным нямецкім паняццем ці перадаюць яго зусім іншыя адценні. Гэта можна прасачыць на прыкладзе выкарыстання ў навуковых выданнях розных варыянтаў назвы адной і той жа афіцыйнай установы, напрыклад: "Рейхсминистерство по делам оккупированных восточных областей",[7] "Рейхсминистерство оккупированных восточных областей",[8] "Рейхсминистерство по оккупированным восточным территориям",[9] "Імперскае міністэрства па справах акупіраваных усходніх абласцей."[10]

* Лозэ (ням., Lohse, Hienrich), [1896 — 1964]. Працоўную дзейнасць пачаў у якасці гандлёвага служачага. У 1915—1916 браў удзел у першай сусветнай вайне, аднак па прычыне ранення быў вызвалены ад службы. З 1921 у складзе Нацыянал-сацыялістычнай партыі. З 1925 — гаўляйтэр НСДАП у Шлезвіг-Гальштэйне, потым дэпутат рэйхстага. З 1928 абіраецца дэпутатам ландтага (парламента зямлі — *заўвага аўтара*. — С.Н.) Прусіі, з 1933 — обер-прэзідэнт зямлі Шлезвіг-Гальштэйн. Обер-групэнфюрэр СС. З 1941 — рэйхскамісар Остланда, імперскі камісар Прыбалтыкі. У 1948 асуджаны да 10 гадоў турэмнага зняволення, аднак выйшаў з турмы ў 1951 г.

**Гітлер (ням., Hitler, Adolf), [1889 — 1945], сапраўднае прозвішча Шыкльгрубер. З 1921 года фюрэр Нацыянал-сацыялістычнай партыі, кіраўнік германскай фашысцкай дзяржавы — Трэцяга Рэйху (у 1933 стаў рэйхсканцлерам, у 1934 спалучыў пасаду канцлера з пасадай прэзідэнта). Усталяваў у Рэйху рэжым фашысцкага тэрору. Непасрэдны ініцыятар развязвання другой сусветнай вайны 1939 — 1945, вераломнага нападу на СССР (22 чэрвеня 1941). Адзін з галоўных арганізатараў масавага знішчэння ваеннапалонных і мірнага насельніцтва на акупаваных тэрыторыях. З уступленнем савецкіх войскаў у Берлін пакончыў жыццё самагубствам. На Нюрнбергскім працэсе Міжнародным ваенным трыбуналам абвінавачаны ў якасці галоўнага нацысцкага ваеннага злачынцы.

*** Кейтэль (ням., Keitel, Wilchelm),[1882 — 1946] — нямецкі генерал-фельдмаршал (1940). У 1938 — 1945 з'яўляўся начальнікам штаба вярхоўнага галоўнакамандавання ўзброенымі сіламі Трэцяга Рэйху — вермахта. Вінаваты ў масавым знішчэнні ваеннапалонных і мірнага насельніцтва на акупаваных тэрыторыях. Падпісаў акт аб капітуляцыі Германіі. На Нюрнбергскім працэсе ў дачыненні да Кейтэля, як аднаго з галоўных нацысцкіх ваенных злачынцаў, вынесены прысуд у смяротным пакаранні.

Вызначэнне канкрэтнай сутнасці назвы згаданай дзяржаўнай установы гітлераўскай Германіі і дакладнага азначэння гэтак званага "Усходняга міністэрства" стала магчыма менавіта пасля знаёмства з прыведзеным вышэй архіўным дакументам, які намі разглядаецца ў якасці асноўнай крыніцы для навуковага тлумачэння.

З "Першага ўказа" вынікае, што ў якасці афіцыйнай назвы Гітлерам было зацверджана "Імперскае міністэрства па новазанятых усходніх тэрыторыях" (*падкрэслена аўтарам.* — С.Н.). На наш погляд, такі падыход мае пад сабой наступныя абгрунтаванні:

*па-першае,* аўтар схіляецца да ўжытку тэрміна "тэрыторыя" на падставе гістарычных момантаў існавання не савецкай, а нямецкай дзяржавы, у якой адсутнічала падобная адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка;

*па-другое*, нямецкамоўнае тлумачэнне згаданага тэрміна ставіць на першае месца якраз тэрыторыю, а толькі потым вобласць, аднак апошняе азначэнне ўжываецца хутчэй у разуменні не часткі якой-небудзь тэрыторыі, а ў якасці вызначэння лакальных межаў якой-небудзь з'явы, зоны, прасторы;

*па-трэцяе,* першы і другі сказы дакумента маюць дапасаванне толькі ў выпадку выкарыстання тэрміна тэрыторыя (*падкрэслена аўтарам.* — С.Н.), паколькі адзіночны лік назоўніка ў беларускай ці рускай мовах не будуць захоўваць згаданага трывання адразу да некалькіх адзінак, якімі ў дакументальнай крыніцы адначасова з'яўляюцца назвы аж чатырох дзяржаў.

Гэта значыць, першапачаткова быў бы ўжыты тэрмін множнага ліку — тэрыторыі (*падкрэслена аўтарам.* — С.Н.). Адсюль вынікае, што ў назве згаданай дзяржаўнай установы Трэцяга Рэйху больш дакладным можна лічыць тэрмін тэрыторыя. Але, па нашым меркаванні, гэта толькі адзін бок разгляду сутнасці вызначанай назвы "Усходняга міністэрства".

Другі бок вымагае яшчэ больш прынцыповага і рашучага кроку ў напрамку да вызначэння сутнасці назвы "Рэйхсміністэрства па занятых усходніх тэрыторыях". Аднак, як было паказана вышэй, доўгі час для назвы гэтай афіцыйнай установы ў беларуска- і рускамоўнай гістарычнай літаратуры ўжываўся тэрмін "акупіраваных" ці "оккупированных". Аднак гэта не вынікае з наступных доказаў:

*па-першае*, назва міністэрства ўзнікла значна раней за пачатак ваенных дзеянняў на Усходзе і акупацыі заходніх абласцей СССР, паколькі праект "Указа фюрэра аб кіраванні на новазанятых усходніх тэрыторыях" быў падрыхтаваны 16.05.41;[11]

*па-другое*, Розенберг, які быў прызначаны фюрэрам у якасці рэйхсміністра "Усходняга міністэрства", не мог прапанаваць Гітлеру варыянт назвы, дзе б у якасці вызначальнага адразу ўводзіўся ва ўжытак тэрмін "акупаваная тэрыторыя", і паказаць фюрэру сутнасць палітыкі, якая, такім чынам, прынцыпова розніласа ад праграмных дакументаў Нацыянал-сацыялістычнай партыі;[12]

*па-трэцяе*, Розенберг быў па паходжанні прыбалтыйскім немцам, таму добра памятаў мінулае нямецкай дзяржавы, якая з XIII стагоддзя на працягу больш двух вякоў мела непасрэднае дачыненне да ўсходніх тэрыторый, асабліва зямель

Прыбалтыкі і Беларусі. Таму ў гэтым выпадку прапанова Розенберга грунтавалася хутчэй на думцы аб вяртанні, а не акупацыі былых тэрыторый;

*па-чацвёртае*, з пункту погляду моўнага перакладу нямецкага тэрміна "besetzt, -en" трэба зыходзіць, на нашу думку, не толькі з яго перакладу на беларускую ці рускую мовы, але і наадварот, у выпадку чаго атрымліваецца, што беларуска- ці рускамоўны тэрмін "заняць" у адваротным перакладзе на нямецкую мову не мае азначэння "акупаваць" ці "оккупировать";

*па-пятае*, сярод архіўных крыніц, як бясспрэчнага падмурка навуковых гістарычных ведаў, сустракаюцца пацверджанні нашых разважанняў на карысць афіцыйнай назвы міністэрства, аднак не акупаваных, а менавіта занятых[13] (*падкрэслена аўтарам.* — С.Н.) усходніх тэрыторый;

і *па-шостае,* нельга не мець на ўліку і факт навуковага ўжытку канкрэтных азначэнняў, якія выкарыстоўваюць дачыненні да гэтага тэрміна ў нямецкіх гістарычных працах, дзе тэрмін акупацыйная палітыка вызначае характар дзейнасці гітлераўскай Германіі, аднак не знаходзіць адбітак ці адлюстраванн е ў афіцыйнай назве адной з устаноў Трэцяга Рэйху — "Імперскага міністэрства па ўсходніх занятых тэрыторыях"[14].

Такім чынам, публікацыя новага архіўнага дакумента заўсёды лічыцца сенсацыйнай з'явай у навуковым жыцці, прычым не толькі ў прафесійных даследчыкаў, але і шырокага кола аматараў айчыннай гісторыі. Знайсці адэкватныя адказы на гістарычныя падзеі, як сведчыць наш прыклад, можна толькі ў выніку сумеснага пошуку новых дакументальных крыніц, а таксама іх аб'ектыўнага аналізу. Далейшы пошук "новых падыходаў да падзей другой сусветнай вайны",[15] як пра гэта сцвярджаюць аўтары найноўшага крыніцазнаўчага і гістарыяграфічнага выдання "Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны" (Мн., 1999), — задача, вырашэнне якой стане надзейным падмуркам для глыбокага вывучэння і ведання сапраўднай гісторыі нашай Айчыны.

У святле змяненняў, што адбыліся ў нашай краіне і ва ўсім свеце на працягу апошняга дзесяцігоддзя, становіцца больш відавочным, што рух наперад як кожнага гісторыка, так і ўсёй айчыннай гістарычнай навукі мажлівы на аснове навуковай гістарычнай рэчаіснасці, у падмурку якой ляжаць дакументальныя матэрыялы. Толькі так можна будзе больш поўна і аргументавана адлюстраваць гістарычныя працэсы, з'явы, падзеі і наблізіць іх да навуковай гістарычнай ісціны.

---

[1]Гл. падрабязней: Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны: Праблемы гістарыяграфіі і крыніцазнаўства: Зб. артыкулаў. Мн., 1999.

[2]Гл. дакладней: Советская историческая энциклопедия. В 16-ти томах. М., 1961 — 1976; Нюрнбергский процесс над главными немецкими военными преступниками: Сборник материалов в трех томах. М., 1965 — 1966; "Совершенно секретно! Только для командования!": Документы и материалы. М. 1967; Преступные цели — преступные средства. Документы об оккупационной политике фашистской Германии на территории СССР (1941 — 1944). М., 1968; Дашичев В.И. Банкротство стратегии германского фашизма. Исторические очерки, документы и материалы. В 2-х томах. Т.1—2. М., 1973; Советская военная энциклопедия. В 8-ми томах. М., 1976 — 1980; Нюрнбергский процесс. Сборник материалов. В 8 томах. М., 1987 — 1997; Преступления немецко-

фашистских оккупантов в Белоруссии. 1941 — 1944. Мн., 1965; Белорусские остарбайтеры. Угон населения Беларуси на принудительные работы в Германию (1941 — 1944): Документы и материалы. В 2-х кн. / Сост. Г.Д.Кнатько, В.И.Адамушко и др. Мн., 1996 — 1997; Старонкі ваеннай гісторыі Беларусі. Вып. 2 / Інстытут гісторыі НАН Беларусі. Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя М.Танка. Мн., 1998 і інш.

[3]Гл.: Einsatz im "Reichskommissariat Ostland": Dokumente zum Voelkermord im Baltikum und in Weissrussland 1941 — 1944; Bd. 6 /hrsg. von Wolfgang Benz, Konrad Kwiet, Juergen Matthaeus. — Berlin: Metropol, 1998. — 301 S.

[4]Там жа. С. 18.

[5]Там жа. С. 18 — 19.

[6]Гл.: Das grosse Lexikon des Dritten Reiches. Suedwest Verlag, Augsburg, 1993. S. 475.

[7]Гл.: Нюрнбергский процесс над главными немецкими военными преступниками: Сборник материалов в трех томах. Т. 2. М., 1966. С. 170, 173; Преступные цели — преступные средства. Документы об оккупационной политике фашистской Германии на территории СССР (1941 — 1944)..., С. 57, 59, 61; М.М.Загорулько, А.Ф.Юденков. Крах плана "Ольденбург": (о срыве экономических планов фашистской Германии на временно оккупированной территории СССР). М., 1980. С. 54; Беларуская савецкая энцыклапедыя. Т. 1. Мн., 1969. С. 212 і інш.

[8]Гл.: Белорусские остарбайтеры. Угон населения Беларуси на принудительные работы в Германию (1941 — 1944): Документы и материалы. В 2-х кн. Кн. 1. Мн., 1996. С. 260, 262.

[9]Гл.: Нюрнбергский процесс над главными немецкими военными преступниками: Сборник материалов в трех томах. Т. 1. М., 1965. С. 209; Преступные цели — преступные средства. Документы об оккупационной политике фашистской Германии на территории СССР (1941 — 1944)... С. 50, 51; Большой энциклопедический словарь. М., СПб, 1997. С. 1024.

[10]Гл.: Нямецка-фашысцкі генацыд на Беларусі (1941 — 1944). Мн., 1995. С. 8.

[11]Гл.: Das Deutsche Reich und der Zweite Weltkrieg. Bd. 4. Der Angriff auf die Sowjetunion. Stuttgart, 1987. S. 421.

[12]Гл.: Enzyklopadie des Nationalsozialismus. Hrsg. von Wolfgang Benz, Hermann Graml und Hermann Weiss. Stuttgart, 1998. S. 11.

[13]Гл.: Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь: Ф. 370. Воп. 6. Спр. 79. Л. 3, 3 адв., 4; Ф. 4683. Воп. 3. Спр. 936. Л. 74, 76, 82; Ф. 4683. Воп. 3. Спр. 953. Л. 116, 234.

[14]Гл.: Беларусіка — Albaruthenica: Кн. 7. Беларуска-нямецкае грамадска-культурнае ўзаемадзеянне: гісторыя, сучаснасць, перспектывы. Мн., 1996. С. 3; Bernhard Chiari. Geschichte als eine Reihefolge der Katastrophen. Weissrussische Region als eine okkupierte Gesellschaft: 1939 — 1944/47 // Беларускі гістарычны агляд. Том 3. Сшытак 2. Мн., 1996. С. 211; Anpassung — Kollaboration — Widerstand: kollektive Reaktionen auf Okkupation. Berlin: Metropol, 1996; Roehr Werner (Hrsg.). Okkupation und Kollaboration (1938 — 1945). Beiträge zu Konzepten und Praxis der Kollaboration in der deutschen Okkupationspolitik. Berlin, 1994; Die Baerokratie der Okkupation. Strukturen der Herrschaft und Verwaltung im besetzten Europa. Berlin, 1998; Kultur — Propaganda — oeffentlichkeit. Intentionen deutscher Besatzungspolitik und Reaktionen auf die Okkupation. Berlin, 1998 (*Падкрэслена аўтарам.* — С.Н.)

[15]Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны: Праблемы гістарыяграфіі і крыніцазнаўства... С. 4.